№13 лістапад 2009

Настаўнік.info

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ

# Актыўная ацэнка і адзнака

*Дарагія калегі!*

*Шчыра дзякуем за зычлівыя водгукі на папярэдні нумар, прысвечаны метаду актыўнай ацэнкі. У сваю чаргу, прапануем вашай увазе сціслы пераказ часткі кнігі Дануты Стэрны "Актыўная ацэнка ў практыцы". У раздзеле "Актыўная ацэнка і адзнака" аўтарка тлумачыць сутнасць АА праз яе параўнанне з традыцыйнай адзнакай.*



**Данута Стэрна**

**АКТЫЎНАЯ АЦЭНКА І АДЗНАКА**

*Функцыі актыўнай ацэнкі і адзнакі. Ці можна спалучаць іх абедзве? Як выпрацаваць уласную стратэгію ацэнкі?*

Ацэнка ў школе атаясняецца з баламі. Пры гэтым можна казаць пра два віды ацэнкі.
Першы – перадача зваротнай інфармацыі, якая дапамагае вучню вучыцца.
Другі – ацэнка вынікаў, якая найчасцей выяўляецца праз балы.
Для першага віду будзем ужываць назву актыўная ацэнка, для другога – адзнака.

### *Вывучылі, што...*

У кожным са спосабаў ацэнкі варта звярнуць увагу на прырост ведаў вучня, а не толькі на фармальны вынік. Важна, каб вучні ўсведамлялі, чаму і наколькі яны навучыліся. Прыдатнай у такім выпадку можа быць тэхніка выніковых сказаў. У канцы ўрока альбо пасля пройдзенага раздзела мы просім вучня скончыць сказ: *Сёння я вывучыў, што...* Такім чынам, вучань параўноўвае пачатковы стан сваіх ведаў з выніковым. Дзякуючы выніковым сказам, настаўнік можа пераканацца, ці была дасягнута мэта ўрока.

### *Выніковыя сказы*

У актыўнай ацэнцы мы заклікаем настаўнікаў да прымянення тэхнікі выніковых сказаў на кожным уроку. Карысць з выкарыстання такой тэхнікі маюць і вучні, і настаўнікі.
Вось некалькі прыкладаў вучнёўскіх выніковых сказаў:

*- Сёння я навучыўся лепш каардынаваць плывецкія рухі, дзякуючы чаму – хутчэй пераадольваць дыстанцыю...*

*- Я прыгадаў, што пры памнажэнні на адмоўны лік трэба змяняць знак. Раней думаў, што корань з 1000 – 100, а гэта не так...*

### *Балы патрэбныя*

Актыўная ацэнка не патрабуе скасаваць адзнакі, або адмовіцца ад выстаўлення балаў.
Балы – гэта інфармацыя, ці вучні дастаткова засвоілі пэўны матэрыял. Калі бал невысокі – вучань атрымлівае інфармацыю, што мусіць вярнуцца да тэмы і вывучыць яе зноў. Настаўнік жа, аналізуючы балы, можа зрабіць выснову, што тэму трэба паўтарыць.
Аднак самі балы не інфармуюць, *што* і *як* трэба палепшыць. Настаўнік павінен даць вучням пэўную падказку.
У канцэпцыі актыўнай ацэнкі гаворка ідзе аб зваротнай інфармацыі, а не аб выстаўленні балаў. Настаўнікі бачаць перавагі перадачы вучням зваротнай інфармацыі адносна іх працы. Такая інфармацыя найчасцей мае выгляд пісьмовага ці вуснага каментарыя.

### *Узровень ведаў*

Пры ўжыванні актыўнай ацэнкі неабходна размяжоўваць ролі ->С.2-3

<u>*У краіне*</u>

## Адукацыйныя навіны

**У дзіцячых садках могуць увесці стаўкі настаўніка**

Міністэрства адукацыі Беларусі разглядае магчымасць увядзення ў дзіцячых садках стаўкі настаўніка.
Са словаў міністра адукацыі Аляксандра Радзькова, увядзенне стаўкі настаўніка дазволіць найлепшым выхавальнікам зарабляць больш.

**Сярод выпускнікоў стала модным ехаць у вёску па размеркаванні?**

У Беларусі не плануецца адмяняць дзяржаўнае размеркаванне выпускнікоў.
Міністр адукацыі Аляксанд Радзькоў сцвярджае, што сярод выпускнікоў стала модным ехаць у вёску па размеркаванні, бо "для іх гэта добрая магчымасць зарабіць і атрымаць жытло".

**Мінадукацыі не плануе скарачаць зімовыя і вясновыя канікулы**

Міністэрства адукацыі не плануе скарачаць тэрміны зімовых і вясновых канікул, нягледзячы на часовае спыненне навучальнага працэсу ва ўмовах уздыму захворвання на вострыя рэспіраторныя інфекцыі.
Мяркуецца, што школьнікі "нагоняць" навучальную праграму коштам гадзінаў, адведзеных на факультатыўныя заняткі.

**Рэпетытарства было, ёсць і будзе**

Са словаў намесніка міністра адукацыі Казіміра Фарыно, сучасныя бацькі лепш аплацяць хатняму настаўніку дадатковыя заняткі па асноўных прадметах, чым будуць займацца з дзіцем самастойна.
Намеснік міністра адукацыі адзначыў, што пытанні рэпетытарства будуць унесены ў праект Кодэкса аб адукацыі пры падрыхтоўцы яго да другога чытання (восенню 2010 года).

**АКТЫЎНАЯ АЦЭНКА І АДЗНАКА >> СТАР. 1-3**

**КОНКУРСЫ, АБВЕСТКІ, ПРАГРАМЫ ПАДТРЫМКІ >>> СТАР. 4**

# АКТЫЎНАЯ АЦЭНКА - АЦЭНКА, ЯКАЯ

абедзвюх ацэнак: актыўнай і звычайнай.
Актыўная ацэнка – гэта такая ацэнка, якая дапамагае вучням вучыцца. Адзнака – гэта ацэнка, якая вызначае ўзровень ведаў вучня ў пэўны перыяд.
Абедзве ацэнкі патрэбныя: вучань патрабуе інфармацыі як аб тым, што зрабіў добра і што мусіць палепшыць, так і аб тым, наколькі ён авалодаў пэўнай часткай матэрыялу.
Розніца паміж актыўнай і звычайнай ацэнкамі добра ілюструецца праз параўнанне, пачутае мной на парыжскай канферэнцыі ў лютым 2005 г.:

*- Калі госць у рэстарацыі каштуе суп - гэта адзнака, калі тое ж робіць кухар на кухні, каб упэўніцца, які ў супа смак - гэта актыўная ацэнка. Розніца ў тым, што госць з супам ужо нічога не зробіць, а вось кухар яшчэ можа яго прыправіць.*

**Зваротная інфармацыя**

Падмуркам актыўнай ацэнкі з'яўляецца зваротная інфармацыя, якая паказвае, што вучань зрабіў добра, а што мусіў зрабіць інакш. У зваротнай інфармацыі змяшчаюцца падказкі: якім чынам вучань можа палепшыць працу і ў якім кірунку яму рушыць – гэта матывуе да далейшай працы.
Адзнака мае дачыненне толькі да выніку, актыўная ж ацэнка ўплывае і на працэс навучання.
Многія настаўнікі лічаць, што актыўная ацэнка - гэта тая ж апісальная ацэнка, якая ўжываецца ў малодшых класах. Аднак апісальная ацэнка не змяшчае ўсіх элементаў зваротнай інфармацыі і не можа лічыцца актыўнай ацэнкай.

**Падвядзенне вынікаў**

Некаторыя настаўнікі мяркуюць, што дастаткова проста не ставіць адзнакі ў выглядзе лічбаў, каб ужываць актыўную ацэнку. Замена балаў на пункты, ці смешкі – гэта тое ж выстаўленне адзнак, але ў іншым выглядзе. Адзнака-бал паведамляе вучню толькі тое, наколькі яго праца адхіляецца ці набліжаецца да меркаванага ідэалу. Альбо вымярае працу вучня пасля пэўнага часу навучання, паказвае, колькі ён вывучыў. Мэта апісальнай ацэнкі, найчасцей, – падвесці вынікі працы вучня ў канцы часу, адведзенага на засваенне пэўнай часткі матэрыялу. Звычайна яна не змяшчае канкрэтных падказак, што і як трэба выправіць ці як лепей вучыцца (нават калі і змяшчае, дык запозна - вучань ужо не можа вярнуцца і нешта змяніць).




Адзнака-бал таксама можа выконваць ролю актыўнай ацэнкі: вучань робіць высновы наконт свайго ўзроўню навыкаў, што можа стаць стымулам для паляпшэння адзнакі. Аднак сама адзнака не нясе інфармацыі аб спосабе паляпшэння выніку. Да таго ж, вядома, што кепскі бал не матывуе да працы, ён хутчэй разахвочвае вучня.
Адзначым таксама, што актыўная ацэнка не абмяжоўваецца толькі перадачай зваротнай інфармацыі, гэтак жа як самаацэнка і ўзаемная ацэнка ды іншыя тэхнікі, звязаныя з кантролем навучальнага працэсу.

**Недахопы балаў**

З крытычнымі заўвагамі да ўжывання балаў у ацэнцы вучняў можна пазнаёміцца ў кнізе "Матывацыя да навучання" *(Martin V. Covington, Karen Manheim Teel. Motywacja do nauki. Gdańsk, 2004)*. Вось некаторыя з іх:

- Школьныя адзнакі з'яўляюцца яскравым доказам, наколькі моцна вучні ўцягваюцца ў гонку навучання.



# ДАПАМАГАЕ ВУЧЫЦЦА

- Атрыманне добрых адзнак можа стацца важнейшым за сам працэс навучання.

- Балы могуць выклікаць канфлікт паміж вучнямі і настаўнікам ды стварыць атмасферу недаверу і падазронасці.

- Сістэма балаў цісне на вучняў, правакуе да ашуканства, выпярэджвання іншых любой цаной.

- Школьныя адзнакі вельмі суб'ектыўныя, іх не заўсёды ставяць сумленна ці шчыра.

- Парадокс у тым, што балы матывуюць тых вучняў, якія найменш маюць такую патрэбу, г.зн. пасяховых. Непасяховых вучняў, якім найбольш патрэбна заахвочванне, балы палохаюць.

### *Меней балаў*

Часта чую меркаванне: *калі не будзем ставіць адзнакі, вучні зусім перастануць вучыцца.* Кніга "Матывацыя да навучання" выклікае жаданне неадкладна адмовіцца ад адзнак, але ж мы ўсведамляем, што гэта немагчыма. Адукацыйныя правілы вымагаюць ад настаўнікаў адзнак. Аднак, можна скараціць колькасць адзнак на карысць актыўнай ацэнцы ды карыстацца баламі пры актыўнай ацэнцы.

### *Без раптоўных зменаў*

Калі мяркуеце ўвесці актыўную ацэнку ў сваю практыку, не чыніце раптоўных пастановаў і зменаў – працэс адыходу ад адзнакі павінен быць паступовым. Трэба прызвычаіць і вучняў, і бацькоў да меншай колькасці балаў і вызначыць, якія працы будуць ацэньвацца актыўнай ацэнкай, а якія баламі. Раптоўныя змены могуць мець непажаданыя наступствы.
Калі наважваецеся на скарачэнне звычайных адзнак, памятайце, што ідзяце супраць пануючых у адукацыі звычаяў. Вашы вучні і іх бацькі прызвычаіліся да балаў. Дырэктар школы вымагае ад вас балаў, уся сістэма адукацыі палягае на іх. Змяншаючы колькасць адзнак, вы можаце сустрэць занепакоенасць і супраціў вучняў, бацькоў і адукацыйных уладаў. Таму вы мусіце падрыхтаваць да гэтага сябе, вучняў і бацькоў.
Няма гатовых рэцэптаў, якім чынам узгадніць актыўную ацэнку з адзнакай, кожны настаўнік павінен вызначыць гэта сам ці разам з вучнямі.
Выстаўленне адзнак – гэта вымярэнне ўзроўню ведаў вучня, але ж ад простага вымярэння веда ў не дадаецца.

### *Спраўджваць усіх*

У гэтым годзе намагаюся спраўдзіць усіх вучняў, як хто падрыхтаваўся да ўрока. Раней спраўджвала ўрыўкамі. Цяпер ведаю: каб дапамагчы вучню, мушу дакладна ведаць, наколькі ён даў рады хатняму заданню. Вучні рыхтуюцца да ўрока лепей, нягледзячы на тое, што не выстаўляю адзнак. Чаму? Яны ведаюць, што сёлета праверу ўсіх, паколькі хачу ведаць, з чым яны не могуць зладзіць.
Не трэба, аднак, спалучаць актыўную ацэнку і звычайную адзнаку ў адзін час, або пісаць вучню каментарый да яго працы разам з адзнакай-балам. Настаўнікі могуць лічыць гэта найлепшым выйсцем, бо адначасова даюць вучню зваротную інфармацыю і ацэньваюць узровень яго працы. Але тады губляецца функцыя актыўнай ацэнкі.

### *Размежаваць ацэнкі*

Вучань, які атрымлівае такую падвойную адзнаку, цікавіцца звычайна толькі ступенню і ўжо не чытае каментарый настаўніка. Вучні параўноўваюць свой бал з балам сяброў, вызначаюць, ці яны справядлівыя. Прыгадайце, што робяць вучні, калі аддаяце ім заданні - няўжо дыскутуюць, як можна было лепш выканаць заданне? Не - яны зазіраюць адно аднаму ў працы і параўноўваюць атрыманыя адзнакі. Такім чынам мы страчваем усё, што мог бы даць вучням аналіз напісаных намі каментарыяў. Вучань, які бачыць бал, альбо не чытае, што настаўнік напісаў, альбо праглядае каментарый, шукаючы толькі абгрунтаванне выніковай лічбы.
Размежаванне актыўнай ацэнкі і адзнакі трэба выпрацаваць самастойна.

### *Трэба быць перакананым*

З інфармацыі ад настаўнікаў, якія пачалі працу з актыўнай ацэнкай, вынікае, што абмежаванне колькасці балаў з'яўляецца асноўнай цяжкасцю гэтага метаду, яно можа сутыкнуцца з супраціўам з боку як вучняў, так і бацькоў. Каб пераканаць зацікаўленых, трэба самому быць перакананым.

### *Ад кантролю да супрацы*

Ды і не толькі вучні з бацькамі могуць супраціўляцца змяншэнню колькасці адзнак - гэтаксама і вы можаце адчуваць, што траціце ўладу над класам. Уласна бал дае нам, настаўнікам, пачуццё кантролю і панавання. Дык, можа ўжо прыйшоў час, каб перайсці ад кантролю вучняў да супрацы з імі? Сапраўдны працэс навучання можа развівацца толькі ў атмасферы даверу і супрацы, а кантраляванне і ўзмацненне ўлады пярэчыць такой атмасферы.




Danuta Sterna. Ocenianie kształtujące w praktyce. Warszawa: Centrum Edukacji Obywatelskiej, 2008. S. 58 – 69.

# Абвесткі, конкурсы, праграмы падтрымкі

**Штотыднёвыя сустрэчы ў мінскім Таварыстве беларускай мовы**

Запрашаем моладзь да ўдзелу ў праекце «Дыялог», які прадугледжвае сустрэчы з вядомымі гісторыкамі, краязнаўцамі, фалькларыстамі ды мовазнаўцамі. У межах праекту працуе дыскусійны клуб, дзе абмяркоўваюцца розныя актуальныя праблемы, у тым ліку пытанні гісторыка-культурнай спадчыны.
Сустэчы праводзяцца кожны аўторак у 19.00 у сталічным офісе ТБМ па вул. Румянцава, 13.
Падрабязная інфармацыя на сайце tbm.org.

**Круглы стол «Накірункі развіцця праграм нефармальнага навучання ў моладзевых летніках» у Мінску: 8 снежня 2009 г.**

Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Беларуская Асацыяцыя клубаў ЮНЭСКА» ў рамках праграмы мерапрыемстваў, прысвечаных 20-годдзю арганізацыі, запрашае да ўдзелу ў працы круглага стала прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў і дзяржаўных цэнтраў пазашкольнага навучання і выхавання, якія праводзяць летнія лагеры для дзяцей і моладзі з кампанентам нефармальнага навучання.
Пісьмовыя заяўкі ў адвольнай форме прымаем праз факс: (017) 237 87 91 ці праз электронную пошту dmitrius@belau.info. У заяўцы просім пазначыць наступную інфармацыю: П.І.І.п.б. удзельніка, назва арганізацыі і пасада, кантактны тэлефон і электронны адрас, тэма дакладу для прэзентацыі. Па дадатковую інфармацыю звяртацца да Віталя Нікановіча: тэл. (029) 869 39 21; vnikanovich@gmail.com.

*Апошні тэрмін падачы заявак: 2 снежня 2009 г.*

**Семінар "Чэшскі досвед для Беларусі: Выкарыстанне відэаматэрыялаў у навучальным працэсе і пазакласнай працы" у Мінску: 6 снежня 2009 г.**

Удзельнікі даведаюцца пра чэшскі досвед і метады працы з фільмамі, відэаролікамі, кліпамі, іншымі відэаматэрыяламі на ўроку і падчас пазакласных мерапрыемстваў ды факультатываў. Іншагароднім кампенсуецца даезд пры наяўнасці білетаў.
Кантакты: тэл. (29)7524832 (МТС) - Вольга; metodyka2009@gmail.com.

*Апошні тэрмін падачы заявак – 3 снежня 2009 г.*

**Навучанне для студэнтаў I-III курсаў у ЗША**
Праграма абмену для студэнтаў вышэйшых навучальных установаў (UGRAD) - праграма Бюро па справах адукацыі і культуры Дзяржаўнага дэпартаменту ЗША, адмініструецца Радай міжнародных навуковых даследаванняў і абменаў (IREX). Студэнтам першых, другіх і трэціх курсаў з Беларусі прапануецца магчымасць навучання на працягу акадэмічнага году ва ўніверсітэтах альбо двухгадовых ці чатырохгадовых каледжах ЗША.
Патрабаванні да ўдзельнікаў ды крытэры адбору ў аплікацыйнай форме:
http://nastaunik.info/files/f/644_Aplikacyja.zip

*Апошні тэрмін падачы заявак: 7 снежня 2009 г., да 17.00.*

**Конкурс "Беларускі Настаўнік 2009 года"**

Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай школы" абвяшчае ўжо традыцыйны конкурс для педагогаў усіх тыпаў адукацыйных і выхаваўчых установаў (ад дашкольных да каледжаў), апрача ВНУ, са стажам працы ад трох гадоў.
На кандыдата конкурса запаўняецца анкета (http://nastaunik.info/files/f/328_nast09.doc) рэкамендуючай арганізацыяй, установай ці самім педагогам.
Кантакты: тэл. 8029–7520821; tbskoly@tut.by.

*Апошні тэрмін падачы заявак: 12 снежня 2009 г.*

Настаўнік.інфо.
Інфармацыйна-метадычны бюлетэнь для настаўнікаў
Выдаецца ініцыятыўнай групай стваральнікаў сайта ***Nastaunik.info***
Адрас для допісаў: ***nastaunik.info@gmail.com***
Наклад 200 асобнікаў

**Адукацыйныя візіты ў Польшчу для студэнтаў**

Польска-Амерыканскі Фонд Свабоды, Фонд «Барусія», Калегія Усходняй Еўропы імя Яна Новака-Язеранскага, Фонд адукацыі для Дэмакратыі запрашаюць актыўных студэнтаў з Беларусі наведаць Польшчу з адукацыйным візітам.
Удзельнікі атрымаюць магчымасць пазнаёміцца з дзейнасцю польскіх акадэмічных цэнтраў, грамадскіх арганізацыяў, сустрэцца з вядомымі грамадскімі дзеячамі Польшчы, паўдзельнічаць у лекцыях, майстар-класах, культурных мерапрыемствах.
Праграма забяспечвае поўнае ўтрыманне ўдзельнікаў у Польшчы, разам з жытлом, харчаваннем ды навучаннем, а таксама аплатай праезду і візавай падтрымкай. Веданне польскай мовы не з'яўляецца абавязковай умовай для ўдзелу ў праграме.
Каб падаць заяўку на ўдзел, неабходна запоўніць форму, якая знаходзіцца на сайце http://www.borussia.pl/strony/aktualnosci/aktualnosci.html і даслаць яе на эл. адрас nabor2010@studytours.pl. На гэты ж адрас звяртайцеся па дадатковую інфармацыю.

*Апошні тэрмін падачы заявак: 15 снежня 2009 г.*

**Конкурс дыдактычных матэрыялаў**

Мэтай конкурсу з'яўляецца стварэнне і публікацыя новых дыдактычных матэрыялаў, якія дазволяць моладзі бліжэй пазнаёміцца з жыццём найбліжэйшых суседзяў, іх культурай, гісторыяй і традыцыяй. Падрабязнасці конкурса і форму заяўкі на ўдзел глядзіце на http://www.rita.edudemo.org.pl/

*Апошні тэрмін падачы заявак: 31 снежня 2009 г.*

**Трэнінг па Еўрапейскім грамадзянстве ў Чэхіі: 22–28 сакавіка 2010 г.**

Мэтавая група: кіраўнікі праекта, моладзевыя лідэры, асобы, што працуюць з моладзю.
Мэта – стымуляваць развіццё патрабавальнага, дэмакратычнага і Еўрапейскага грамадзянства, падтрымаць рэалізацыю і падвысіць якасць праграмы «Моладзь у дзеянні», прасоўваць праграмы і структуры падтрымкі асобаў, якія працуюць з моладзю.
Больш падрабязную інфармацыю можна знайсці па адрасе: http://www.european-citizenship.org/courses/, e-mail: eeca@salto-youth.net

*Апошні тэрмін падачы заявак – 12 студзеня 2010 г.*

**Экалагічная стажыроўка ў ЗША: чэрвень-лістапад 2010 г.**
EarthCorps запрашае лідэраў экалагічных арганізацыяў да ўдзелу ў шасцімесячнай экалагічнай навучальнай праграме ў Сіэтле (штат Вашынгтон, ЗША). Напрамкі навучання: экалагічная служба, пабудова грамадзянскай супольнасці, развіццё лідэрскіх якасцяў.
Навучанне бясплатнае.
EarthCorps аплочвае ўдзельнікам праграмы страхоўку, пражыванне ў сем'ях, харчаванне, штомесячную стыпендыю, а таксама спрыяе ў атрыманні навучальнай візы US J-1.
Патрабаванні да стажораў: узрост 18 - 25 год, веданне англійскай мовы, адсутнасць судзімасцяў, прынамсі пяцігадовы досвед працы ў сферы экалогіі альбо прынамсі 4 гады навучання па адпаведнай спецыяльнасці.
Падрабязная інфармацыя: http://www.earthcorps.org/join_international.php

*Апошні тэрмін падачы заявак: 29 студзеня 2010 г.*

**Трэнінг па Еўрапейскім грамадзянстве ў Францыі: 12–18 красавіка 2010 г.**

Мэтавая группа: кіраўнікі праектаў, моладзевыя лідэры, асобы, што працуюць з моладзю.
Мэта – стымуляваць развіццё патрабавальнага, дэмакратычнага і Еўрапейскага грамадзянства, падтрымаць рэалізацыю і падвысіць якасць праграмы «Моладзь у дзеянні», падтрымаць прафесійнае развіццё асобаў, якія працуюць з моладзю і лідэраў праз развіццё крытычнага разумення Еўрапейскага Грамадзянства, выкарыстаць яго патэнцыял у працы з моладзю.
Працоўная мова – англійская.

*Апошні тэрмін падачы заявак – 2 лютага 2010 г.*